ДУА «ЕЛКАЎСКАЯ СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА»

# РЭХА ШКОЛЬНАГА ЖЫЦЦЯ

Агульнашкольная газета Лістапад 2021 Выпуск №11

У гэтым нумары:


Музей сялянскага быта 1

Алімпіяда – адна з агульнапрынятых форм работы са здольнымі вучнямі 2

Народны календар. Лістапад 3

Беларускі каляндар 4


## МУЗЕЙ СЯЛЯНСКАГА БЫТА



У год народнага адзінства вучні працягваюць вывучаць гісторыю, культуру і традыцыі сваёй краіны.

Вучні ДУА “Елкаўская сярэдняя школа” 2 лістапада 2021 года пабывалі на экскурсіі ў Музеі сялянсскага быта ў в.Ярнева. Нягледзячы на тое, што музей створаны нядаўна, сённяшняя калекцыя сабранага дастаткова шырокая. У доме-музеі прадстаўлена каля 100 экспанатаў, але экспазіцыі музея рэчамі з мінулага пастаянна папаўняецца. У музеі дзеці назіралі прадметы рамяства, старую тэхніку, прадметы посуду, якім картысаліся раней.

Прадстаўленныя экспазіцыі – адлюстраванне побыту нашых дзядоў і прадзедаў. Наведванне дома-музея прынесла дзецям шмат станоўчых эмоцый. Дзеці даведаліся шмат новага і цікавага аб культуры і побыце нашых продкаў.

Аўтар: Галонская М.



# АЛІМПІЯДА – АДНА З АГУЛЬНАПРЫНЯТЫХ ФОРМ РАБОТЫ СА ЗДОЛЬНЫМІ ВУЧНЯМІ



Штогод у Рэспубліцы Беларусь праводзяцца алімпіяды па прадметах. Алімпіяда праходзіць у тры туры.

У лістападзе праходзіць другі этап рэспубліканскай алімпіяды. Заданні, якія даюцца вучням маюць больш высокі узровень, чым школьны. Па многіх прадметах ёсць не толькі тэарэтычны, але і практычны тур.

Пераможцамі першага школьнага тура рэспубліканскай алімпіяды ў нашай школе сталі Совік Настасся (геаграфія), Цыганкоў Уладзіслаў (Працоўнае навучанне), Семянюк Ілона (грамадазнаўства), Ганчарэвіч Вікторыя (біялогія), Мекеня Максім (матэматыка), Шышкін Дзмітрый і Кавалёва Вераніка (фізічная культура і здароўе). Віншуем іх і дзякуем за ўдзел у другім раённым этапе алімпіяды.

Па выніках другога раённага тура рэспубліканскай алімпіяды вучаніца 10 класа **Семянюк Ілона** заняла прызавое 3 месца па нямецкай мове (настаўнік **А.В.Лебедзь**).

Аўтар: Чак М.

# НАРОДНЫ КАЛЯНДАР. ЛІСТАПАД

Апошні месяц восені, адзінаццаты – года меў старабеларускую назву грудзень (ад слова «груды» ў значэнні «замёрзлая зямля»). Сучаснае беларускае найменне лістапад тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў (таксама ва ўкраінцаў листопад, палякаў і чэхаў listopad).

У старажытнарымскім календары november – дзевяты.

У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, з`яўляюцца туманы. Вёска на нейкі час вызваляецца ад сельскагаспадарчых работ. Дары асенняга поля і лесу ўжо добра ўладкаваны ў склепах і кладоўках. Самы час успомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў — «дзядоў». Багаты стол запрашае сватоў парадніць сваіх дзяцей. А вечары, што сталі даўжэйшымі, нагадваюць жанчынам аб кудзелі і піліпаўскіх вячорках.

Як звычайна, назіранні селяніна накіраваны на стан прыроды, паводзіны жывёлы, птушак, па якіх ён вызначае будучае надвор`е. Неба ўсю ноч чыстае, але вакол месяца з`явіліся вялікія кругі – будзе мароз; калі ж кругі гэтыя злёгку пачырванеюць – магчымы нават снегапад з ветрам. Калі дым з коміна падымаецца вертыкальна ўверх, няхай сабе і ў непагадзь, хутка надвор`е наладзіцца.

**28 лістапада**. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост). Пачынаецца апошні ў годзе пост — Калядны, або Піліпаўскі (Піліпаўка), які працягваецца да самых Каляд (да 7 студзеня).

**29 лістапада** — Мацей. Восень не саступае зіме, і гэта асаблівасць стану прыроды перададзена ў прыкмеце: «На Мацея дарога пацея».

Аўтар: Салаўёва М.

# БЕЛАРУСКІ КАЛЯНДАР

Лістапад - апошні месяц восені. Гэта дзіўны перыяд, калі восеньская пара паступова саступае месца зіме. У гэты час дажджы ўжо змяняюцца снегападамі, дрэвы скідаюць рэшткі лістоты, а вадаёмы пакрываюцца ільдом. Лістапад - месяц, у якім людзі пільна сачылі за зменамі прыроды. Штогадовы аналіз дадзеных дазваляў нашым прабацькам скласці з назіранняў прыкметы ,якія працуюць і па гэты дзень.

## *ПРЫКМЕТЫ ЛІСТАПАДА:*

Калі лістапад будзе халодным і снежным, то гэта да позняй і халоднай вясне.

Зімовыя маразы не наступяць да таго часу, пакуль хоць адзін лісточак нея ападзе з вішнёвага дрэва.

Птушкі доўга кружаць зграяй у небе - да снега.

Калі птушкі занялі ніжнія галінкі дрэў – чакай моцных парываў ветру.

Зоркі ў начным небе маюць рознакаляровы адліў - да працяглай непагадзі.

Начны іней абяцае дзень без ападкаў.

Нізкія аблокі - да рэзкага пахаладання.

Аўтар: Цітоў П.